Падтрымай "Вясну" на PATREON

Ізноў суды за Першамай: Леаніду Кулакову - 40 базавых, суд над Губарэвічам перанесены дапоўнена

18.05.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Леанід Кулакоў пасля арышту.

Старшыню Руху «За Свабоду» **Юрася Губарэвіча** і актывіста “Еўрапейскай Беларусі” **Леаніда Кулакова** сёння чакаюць суды за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу на Кастрычніцкай плошчы Мінска, які адбыўся 1 траўня. Справы разглядаюцца ў судзе Першамайскага раёна. Пачатак працэсу ў Губарэвіча - 10-00, у Кулакова ў14-30.

Разгляд справы Губарэвіча суддзя **Сідарок** перанесла на 19 траўня, паколькі ён заявіў хадайніцтва выклікаць у суд у якасці сведкі Алеся Кіркевіча.

Леанід Кулакоў на паседжанне па сваёй справе прыйшоў з рэчамі і папрасіў суддзю Сідарок прысудзіць яму суткі арышту. Аднак суддзя вырашыла інакш і аштрафавала актывіста на 40 базавых велічынь.

А 19 траўня на 10 гадзін ў судзе Маскоўскага раёна Мінска прызначаны разгляд адміністратыўнай справы **Марыны Адамовіч**.

Нагадаем, за першамайскую акцыю ў Мінску на гэты час арыштамі і штрафамі пакараныя 10 чалавек, сярод якіх **Уладзімір Някляеў, Павел Севярынец, Максім Вінярскі, Вячаслаў Сіўчык** ды іншыя ўдзельнікі мітынгу.

Усяго па інфармацыі праваабаронцаў супрацоўнікі міліцыі склалі рапарты амаль на два дзесяткі чалавек. Можна меркаваць, што судовы канвеер за Першамай яшчэ ў самым разгары.

Твитнуть





Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

EENEMO





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY